# ВІТАЛЬ ЦВІРКА

Виталий Цвирко Vital Tsvirka



Славутыя мастакі з Беларусі
Знаменитые художники из Беларуси
Famous artists from Belarus

# ВІТАЛЬ ЦВІРКА
## Виталий Цвирко Vital Tsvirka

*2-е выданне*



Мінск
«Беларусь»

УДК [75(476)+929Цвірка](084.1)
ББК 85.143(4Беи)я6
В54

*Серыя заснавана ў 2012 годзе*

Аўтар ідэі і каардынатар праекта *У.І. Пракапцоў* —
генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея
Рэспублікі Беларусь, кандыдат мастацтвазнаўства

Аўтар тэксту і складальнік *Н.Л. Сяліцкая*

На вокладцы: В. Цвірка. Каложа (Царква XII ст. у Гродне). 1969. НММ РБ.

ISBN 978-985-01-1030-5

© Сяліцкая Н.Л., тэкст, складанне, 2012
© Нацыянальны мастацкі музей
Рэспублікі Беларусь, фота, 2012
© Выдавецтва «Беларусь», 2012

Творчасць Віталя Канстанцінавіча Цвіркі — гэта з'ява ў мастацкай культуры Беларусі, якая падзяліла існаванне жанру пейзажа ў айчынным выяўленчым мастацтве на тое, што было да яго, і тое, па якім шляху ён развіваецца зараз. Да В. Цвіркі маляўнічы строй беларускай прыроды ўспрымаўся мастакамі хутчэй у жамчужна-туманных, серабрыстых адценнях, якія былі ўласцівыя палотнам В. Бялыніцкага-Бірулі. В. Цвірка адкрыў яркую, кантрастную, экспрэсіўную прыгажосць родных прастораў. Ён па праву лічыцца наватарам, першаадкрывальнікам у стварэнні адмысловага тыпу маляўнічаэпічнага і лірыка-гераічнага пейзажа, які быў невядомы да гэтага ў беларускім мастацтве.

Віталь Канстанцінавіч Цвірка нарадзіўся 1 (14) лютага 1913 года ў вёсцы Радзеева Гомельскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Буда-Кашалёўскі раён Гомельскай вобласці) у сям'і сельскіх настаўнікаў. З самага ранняга дзяцінства Віталь убіраў тую творчую атмасферу, што панавала ў іх доме. У яго сям'і была добрая бібліятэка, бацька захапляўся мастацтвам, у доме было шмат рэпрадукцый твораў рускіх жывапісцаў-перасоўнікаў: В. Пярова, І. Рэпіна, І. Крамскага. Нядзіўна, што з часам хлопчык сам пачаў маляваць.

Лёс спрыяў развіццю таленту В. Цвіркі. Ён сустрэў на сваім жыццёвым шляху яркіх, незвычайных мастакоў-педагогаў, якія сваім прафесіяналізмам, аўтарытэтам, светапоглядам аказалі вялікі ўплыў на творчы рост хлопчыка. Яшчэ ў школе (да таго часу сям'я пераехала

ў Мінск) В. Цвірка браў прыватныя ўрокі ў М. Станюты і А. Тычыны, якія стаялі ля вытокаў беларускага мастацтва савецкага перыяду. Віталь з задавальненнем меў зносіны з сябрам сям'і Кандратам Атраховічам (Крапівой), беларускім пісьменнікам, паэтам, драматургам, які быў частым госцем у іх доме. Пазней В. Цвірка ўспамінаў: «Кандрат Кандратавіч значна паглыбіў мае веды ў малюнку. Мала хто ведае, што ён валодаў талентам мастака. Крапіву я лічу адным з першых сваіх настаўнікаў у мастацтве... »[1].

Пасля заканчэння мінскай школы адукацыю В. Цвірка прадоўжыў у Віцебскім мастацкім тэхнікуме (1929—1932). Тут яму пашчасціла вучыцца ў вядомых беларускіх мастакоў: І. Ахрэмчыка, Л. Лейтмана, В. Руцая, У. Хрусталёва, Ф. Фогта, М. Эндэ. Ужо тады ў пачынаючага мастака сфарміравалася цвёрдая пазіцыя ў творчасці, згодна з якой ён імкнуўся сам (а далей стараўся перадаць дадзеную ўстаноўку шматлікім вучням) ніколі не пісаць «пад кальку», а заўсёды адлюстроўваць праз прызму ўласнай душы разнастайнасць навакольнага свету.

Вярнуўшыся пасля вучобы ў Мінск, з 1932 па 1935 год Віталь Канстанцінавіч выкладаў малюнак і чарчэнне ў педагагічным вучылішчы і 25-й агульнаадукацыйнай школе. У гэты ж час (1933) В. Цвірка быў абраны членам аргкамітэта Саюза мастакоў СССР. У 1935 годзе ён паступіў у Маскоўскі дзяржаўны мастацкі інстытут, дзе вучыўся ў знакамітых рускіх пейзажыстаў С. Герасімава, Г. Ражскага, П. Пакаржэўскага, Б. Іагансона, А. Дайнекі, І. Грабара. На ўсё жыццё В. Цвірка запомніў словы прафесара П. Пакаржэўскага: «На пейзаж я гляджу як на крыніцу жывой сувязі з прыродай, успрымаю яго як музыку, як паэзію»[2]. Другім выдатным мастаком і педагогам, што паўплываў на развіццё таленту Віталя Канстанцінавіча, быў С. Герасімаў, які прывіваў студэнтам

---

[1] Виталий Цвирко. Каталог выставки произведений / Авт. вступ. статьи О. А. Сурский. — Москва, 1983. — 32 с. : ил.

[2] Віталь Цвірка. Выстаўка твораў народнага мастака БССР, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння. Каталог / Склад.: І. В. Назімава. — Мінск: Беларусь, 1988. — 24 с. : іл.

«упартую працавітасць, імкненне да цэльнасці, яснасці, прастаты»[3]. Паступова назапашаны ў маскоўскай навучальнай установе багаты вопыт трансфармаваўся ва ўласнае мастацкае бачанне майстра. Ужо падчас вучобы ў інстытуце В. Цвірка вызначыў для сябе прыярытэты ў мастацтве: ён зрабіў свой выбар на карысць жанру пейзажа. Яшчэ знаходзячыся ў Самаркандзе (Узбекістан), куды ў 1942 годзе быў эвакуіраваны Маскоўскі дзяржаўны мастацкі інстытут, В. Цвірка стварыў цыкл эцюдаў, у якіх адлюстраваў своеасаблівасць паўднёвай прыроды («Раніца ў кішлаку», «На осліку», «Узбекскі дворык»; усе — 1943). Аднак сярод карцін, напісаных у 1940—1950-я гады, ёсць і сюжэтна-тэматычныя кампазіцыі, непазбежныя ў творчасці любога савецкага мастака таго часу, які хацеў «не выпасці» за рамкі афіцыйнага мастацтва. Такім творам стала дыпломная праца «Першы арышт І. В. Сталіна» (1942), якую Віталь Канстанцінавіч з поспехам абараніў у Самаркандзе. Пасля ім былі створаны такія буйнамаштабныя кампазіцыі на гістарычныя сюжэты, як «Нязкораныя» (1947), «Паўстанне рыбакоў на возеры Нарач» (1957) і інш. Але для В. Цвіркі зварот да шматфігурных палотнаў на гісторыка-рэвалюцыйную тэму быў вельмі непрацяглым перыядам у творчасці.

У 1944 годзе Віталь Канстанцінавіч стаў членам Маскоўскага аддзялення Саюза мастакоў СССР. У гэтым жа годзе ён вярнуўся ў беларускую сталіцу, дзе практычна адразу атрымаў буйны заказ на стварэнне серыі мемарыяльных гарадскіх пейзажаў, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама партрэтаў удзельнікаў партызанскага руху для Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Стварыўшы значныя сюжэтна-тэматычныя кампазіцыі, якія адказвалі патрабаванням сацыялістычнага рэалізму (як вынік — у 1946 годзе В. Цвірка быў прыняты ў Саюз мастакоў БССР), ён, тым не менш, не пакідаў творчых

[3] Виталий Цвирко. Каталог выставки произведений / Авт. вступ. статьи О. А. Сурский. — Москва, 1983. — 32 с. : ил.

пошукаў у трактоўцы вобраза роднай беларускай прыроды. Ён адчуваў, што менавіта пейзаж — гэта той жанр, у якім магчыма найбольш поўна раскрыць лепшыя бакі свайго таленту. Не выключана, што на выбар мастака паўплывала і тое, што ён вярнуўся на радзіму яшчэ да заканчэння вайны. Мінск ляжаў у руінах. Неверагодны хаос панаваў навокал. Убачанае пакінула глыбокі след у душы і памяці мастака. У Мінску В. Цвірка канчаткова ўмацаваўся ў пазіцыі пейзажыста. «Хацелася выпісаць кожнае дрэва, кожны кусцік, ручай, масток, таму што ўсё гэта для мяне сімвалізавала вяртанне на родную зямлю. Пейзаж быў адваяваным багаццем», — успамінаў мастак пазней[4].

У 1940-я — пачатку 1950-х гадоў яго эцюды яшчэ не валодалі тым непаўторным аўтарскім почыркам, які праз дзесяцігоддзе будзе заўсёды вылучаць творы В. Цвіркі з шэрагу іншых. Аднак ужо ў такіх карцінах, як «Сакавік», «Сакавік. Халодны дзень» (абедзве — 1947 год), адгадваўся будучы вялікі пейзажыст. Гэтыя творы адрозніваюцца выключным пачуццём колеру, свабодай жывапіснай мовы. У іх мастак беспамылкова перадаў ледзь улоўны пераходны стан у беларускай прыродзе, напоўніў змест непасрэдным лірычным перажываннем. Мастацтвазнаўца І. Назімава так характарызуе дадзеныя карціны: «Экспрэсія мазка нагадвае эцюды самаркандскай серыі, аднак іх гарачы каларыт змяняецца да прыглушанай гамы, якая найбольш адпавядае скупому сонцу Беларусі... Сціплыя сельскія матывы пад пэндзлем мастака пачынаюць гучаць, як струны яго душы»[5].

У сілу аб'ектыўных прычын у перыяд з 1948 па 1953 год мастаком не было створана нічога, што адпавядала б сапраўднай моцы яго таленту. Аднак, будучы яркім, таленавітым, энергічным чалавекам, Віталь Канстанцінавіч кампенсаваў некаторую «зажатасць» у творчасці пры дапамозе выкладчыцкай дзейнасці, у якой дасягнуў значных поспехаў.

---

[4] Віталь Цвірка. Выстаўка твораў народнага мастака БССР, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння. Каталог / Склад.: І. В. Назімава. — Мінск: Беларусь, 1988. — 24 с. : іл.

[5] Там жа.

З 1947 па 1953 год В. Цвірка навучаў студэнтаў малюнку, жывапісу і кампазіцыі ў Мінскім мастацкім вучылішчы, у 1956—1963 гадах загадваў кафедрай жывапісу ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. У 1958 годзе яму было прысвоена вучонае званне дацэнта і ён стаў рэктарам гэтага ж інстытута.

Смелы наватар, які меў актыўную пазіцыю ў жыцці і творчасці, В. Цвірка ва ўсім імкнуўся да дасканаласці. У сістэме выкладання ён выкарыстоўваў уласныя метады. Для яго было прынцыпова важным заўсёды падтрымліваць непасрэдную сувязь са студэнтамі. Народны мастак Беларусі Л. Шчамялёў з удзячнасцю гаварыў, што менавіта ён, Віталь Канстанцінавіч, цудоўны жывапісец і настаўнік, у тыя студэнцкія гады падтрымаў яго ў няпростых пошуках уласнага мастацкага «я». Аб славутых пленэрах, на якія В. Цвірка часта выязджаў са студэнтамі, можна пісаць бясконца. У мастацкім асяроддзі да гэтага часу пра гэта ходзяць легенды... Менавіта ў нязмушаных паўфармальных абставінах маэстра адкрываў вучням усё новыя гарызонты хараства прыроды Беларусі і сакрэты свайго майстэрства. У гэтым В. Цвірка, свядома ці не, прытрымліваўся традыцыі старых майстроў, калі настаўнік працаваў побач са сваімі падапечнымі і тыя маглі непасрэдна назіраць за працэсам стварэння шэдэўра. Ён вучыў, што нельга абыякава пісаць прыроду, трэба, перш за ўсё, адчуць унутры сябе імпульс, запаліць іскру, прасякнуцца глыбіннай мудрасцю законаў гармоніі, па якіх існуе ўсё жывое на зямлі, і самому стаць часткай гэтага... «Толькі сам-насам з прыродай можна пачуць яе сэрца», — казаў В. Цвірка[6].

Бліжэй да сярэдзіны 1950-х гадоў, калі яму было ўжо за сорак, у майстра пачаўся творчы ўздым. Шмат у чым гэта было абумоўлена агульнымі зменамі, якія адбыліся ў грамадскай і мастацкай сферах жыцця краіны. З гэтага часу шматграннае і непаўторнае аблічча беларускай прыроды

---

[6] Віталь Цвірка. Выстаўка твораў народнага мастака БССР, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння. Каталог / Склад.: І. В. Назімава. — Мінск: Беларусь, 1988. — 24 с. : іл.

з'яўлялася для В. Цвіркі нязменнай невычэрпнай крыніцай натхнення. Адным з першых пейзажаў, які стаў «паваротным» у творчым лёсе мастака, можна назваць карціну «Каля млына» (1954), напісаную на Стаўбцоўшчыне. З гэтага часу яго талент загучаў у поўную сілу. Дзякуючы актыўнай творчай пазіцыі, бясспрэчнаму аўтарытэту сярод калег і таму ўкладу, які ён унёс у развіццё нацыянальнай школы жывапісу, Віталь Канстанцінавіч быў прызначаны сакратаром праўлення Саюза мастакоў СССР (1961—1967), а з 1962 па 1963 год узначальваў Саюз мастакоў БССР.

Прынцыпам работы В. Цвіркі стаў пастаянны пошук новых вобразных матываў родных пейзажаў, іх арыгінальных кампазіцыйных рашэнняў. Ён аддаваў перавагу рабоце на ўлонні прыроды, атрымліваў неабходны творчы імпульс ад непасрэдных зносін з ёй. Пісаў на адным дыханні: яму хапала аднаго — двух сеансаў. В. Цвірка ўмеў улавіць у кожным матыве тое галоўнае, што вызначала яго сутнасць, пры гэтым свае яркія ўражанні ён віртуозна абагульняў сучаснымі выяўленчымі прыёмамі.

У канцы 1950 — пачатку 1960-х гадоў новым для мастацкай мовы станковага жывапісу стала прыўнясенне ў яго лаканізму, экспрэсіўнасці, вострых лінейных рытмаў, каларыстычнай стрыманасці з яркімі каляровымі акцэнтамі — сродкаў выразнасці, характэрных для манументальнага мастацтва. Гэта было звязана з так званым «суровым стылем», які прыйшоў на змену пафаснаму мастацтву сталінскай эпохі. У жанры пейзажа такія тэндэнцыі выявіліся ў стварэнні палотнаў эпічнага гучання, абагульненых вобразаў-сімвалаў роднай зямлі. У карцінах дадзенага перыяду («Лагойскі сказ» (1960), «Мая Радзіма» (1960), «На возеры Свір» (1962), «Нёман» (1962), «Сказанне пра Палессе» (1964—1965) і «Браслаў» (1966) (абедзве — з серыі «На зямлі беларускай»)) В. Цвірка імкнуўся найбольш поўна выявіць тыповыя прыкметы беларускай прыроды і ў яркай маляўнічай форме ўвасобіць прыгажосць прастораў роднай Беларусі, захаваць яе рамантычны вобраз. За серыю пейзажаў

у 1963 годзе В. Цвірку было прысвоена ганаровае званне «Народны мастак БССР», а ў 1967 годзе за серыю пейзажаў «На зямлі беларускай» — ганаровае званне «Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР». Аднак мастак даволі хутка адышоў ад захаплення «суровым стылем». Яго яркае выдатнае дараванне не магло абмежавацца ні адным з канонаў, якія існавалі ў мастацтве. На аснове сінтэзу ўражанняў ад непасрэднага назірання прыроды ў мастака выпрацаваўся своеасаблівы стыль, які адрозніваўся ад усяго таго, што было зроблена ім у папярэдні перыяд. Нягледзячы на пераход да экспрэсіўнага мазка, яго пейзажы станавіліся ўсё больш рэалістычнымі. Пры гэтым майстар лічыў, што «...важна захоўваць такі погляд на прыроду, каб пейзаж пазнаваўся менавіта як беларускі, які не зблытаеш ні з якім іншым»[7].

Ён стварыў шматлікія пейзажы-паданні, якія сталі класікай беларускага жывапісу («Браслаў» (1966), «У Пясках» (1966), «Родны край» (1968), «Стоўбцы» (1968), «Ганча — зямля партызанская» (1969), «Каложа» (1969), «Заслаўе» (1974), «Сакавіцкае сонца» (1982), «Ружовы дзень» (1982)). У творах В. Цвіркі амаль заўсёды адсутнічалі знешнія прыкметы часу. Пры гэтым сам вобразны строй яго карцін, арыгінальнасць кампазіцыйных рашэнняў, энергічны лінейны рытм, магутны каларыт, экспрэсіўны мазок адпавядалі духу эпохі, у якую жыў і тварыў маэстра. У лепшых творах В. Цвіркі заўсёды прысутнічала свая нязменная тэма і свой лейтматыў.

З 1980-х гадоў В. Цвірка захапіўся жанрам нацюрморта, які значна ўзбагаціў яго эксперыментальную творчасць. Манументальны эпічны лад кампазіцыйных рашэнняў нацюрмортаў (характэрны для творчасці сталага майстра ў цэлым) спалучаўся з камернасцю, інтымнасцю («Нацюрморт з вазай. Восеньскі матыў», «Нацюрморт з люстэркам», «Нацюрморт з нарцысамі», усе — 1982). У іх В. Цвірка сцвярджаў паэзію штодзённасці і захапляўся ёю, угледзеўшы ў штодзённым Вечнасць.

[7] Крепак Б. А. Виталий Цвирко / Б. А. Крепак. — Минск: Беларусь, 1985. — 427 с. : ил.

Майстар у роўнай ступені валодаў рознымі тэхнікамі: акварэллю, тэмперным і алейным жывапісам. Безумоўна, перавагу ён аддаваў апошняму. Аднак яго акварэльныя эцюды заслугоўваюць асобнага разгляду. Прырода гэтага матэрыялу была сугучная творчаму тэмпераменту Віталя Канстанцінавіча. Акварэльныя пейзажы В. Цвіркі адрозніваюцца незвычайнай свабодай валодання тэхнікай і вобразнай непаўторнасцю. У такіх акварэлях мастака, як «Позняя восень», «Адліга» (абедзве — 1975), «Лагойшчына», «Першая зеляніна», «Талы снег», «Царква ў Заслаўі» (усе — 1980), адчуваецца асаблівы стан паветранага асяроддзя беларускай прыроды. Нярэдка майстар выкарыстоўваў акварэль для стварэння зімовых пейзажаў. Некранутая беласць паперы прасвечвае скрозь празрысты пласт вадзяных фарбаў у карціне «Касцёл у Ракаве» (1980). У гэтай рабоце В. Цвірка, шляхам лёгкіх размывак і найтанчэйшых каляровых нюансаў, дамогся эфекту пераліваў святла на пышнай паверхні снегу.

Ужо сучаснікі разумелі значэнне творчасці В. Цвіркі для нацыянальнай школы жывапісу Беларусі і ацанілі яго заслугі: за асобы ўнёсак у развіццё беларускага мастацтва яму было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР» (1955), акрамя гэтага мастак быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), медалём Францыска Скарыны (1993) і інш.

Не стала маэстра 11 чэрвеня 1993 года. Ён пайшоў з жыцця на 81-м годзе і быў пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

Віталь Цвірка з тых мастакоў, каго беспамылкова пазнаеш не па подпісу, але па аўтарскім почырку. Сваёй творчасцю Віталь Канстанцінавіч шмат у чым заклаў традыцыі, па якіх працягвае развівацца беларускі пейзажны жывапіс. Ён выхаваў цэлую плеяду вучняў, многія з якіх пасля зрабілі значны ўклад у развіццё айчыннага мастацтва. «Маімі сапраўднымі паслядоўнікамі з'яўляюцца тыя мастакі, якія вучыліся ў мяне, але іх творы зусім непадобныя на мае. Гэта —

Л. Шчамялёў, Д. Алейнік, Б. Аракчэеў, М. Казакевіч, Г. Паплаўскі, І. Рэй і многія іншыя», — казаў В. Цвірка[8].

Творы В. Цвіркі знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, фондах Беларускага саюза мастакоў, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, краязнаўчых музеях Беларусі, Траццякоўскай галерэі ў Маскве і іншых музеях Расійскай Федэрацыі, а таксама прыватных калекцыях Беларусі і замежных краін. На сённяшні дзень збор карцін Віталя Цвіркі ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь — 156 твораў — з'яўляецца адным з самых буйных у свеце. Калекцыя ў поўнай меры адлюстроўвае асноўныя этапы творчасці майстра.

*Наталля Сяліцкая*

---

[8] Крепак Б. А. Виталий Цвирко / Б. А. Крепак. — Минск: Беларусь, 1985. — 427 с. : ил.

Творчество Виталия Константиновича Цвирко — это явление в художественной культуре Беларуси, которое поделило существование жанра пейзажа в отечественном изобразительном искусстве на то, что было до него, и то, по какому пути оно развивается сейчас. До В. Цвирко живописный строй белорусской природы воспринимался художниками скорее в жемчужно-туманных, серебристых оттенках, свойственных полотнам В. Бялыницкого-Бирули. В. Цвирко открыл яркую, контрастную, экспрессивную красоту родных просторов. Он по праву считается новатором, первооткрывателем в создании особого типа картинно-эпического и лирико-героического пейзажа, неведомого до этого в белорусском искусстве.

Виталий Константинович Цвирко родился 1(14) февраля 1913 года в деревне Радеево Гомельского уезда Могилевской губернии (ныне Буда-Кошелевский район Гомельской области) в семье сельских учителей. С самого детства Виталий впитывал ту творческую атмосферу, что царила у них в доме. У его родителей была хорошая библиотека, отец увлекался искусством, в доме было много репродукций произведений русских живописцев-передвижников: В. Перова, И. Репина, И. Крамского. Неудивительно, что со временем мальчик сам начал рисовать.

Судьба благоприятствовала развитию таланта В. Цвирко. Он повстречал на своем жизненном пути ярких, незаурядных художников-педагогов, своим профессионализмом, авторитетом, мировоззрением оказавших огромное влияние на творческий рост мальчика. Учась в школе (к тому времени семья переехала в Минск), В. Цвирко брал частные уроки

у М. Станюты и А. Тычины, которые стояли у истоков белорусского искусства советского периода. Виталий с удовольствием общался с другом семьи Кондратом Атраховичем (Крапивой), белорусским писателем, поэтом, драматургом, который был частым гостем в их доме. Впоследствии В. Цвирко вспоминал: «Кондрат Кондратович значительно углубил мои познания в рисунке. А ведь мало кто знает, что он владел незаурядным даром художника. Крапиву я считаю одним из первых своих наставников в искусстве…» [1].

После окончания минской школы образование В. Цвирко продолжил в Витебском художественном техникуме (1929—1932). Здесь ему посчастливилось учиться у известных белорусских художников: И. Ахремчика, Л. Лейтмана, В. Руцая, В. Хрусталева, Ф. Фогта, М. Энде. Уже тогда у начинающего художника сформировалась твердая позиция в творчестве, согласно которой он стремился сам (а в дальнейшем старался передать данную установку многочисленным ученикам) никогда не писать «под кальку», а всегда выражать сквозь призму собственной души многообразие окружающего мира.

Вернувшись после учебы в Минск, с 1932 по 1935 год Виталий Константинович преподавал рисунок и черчение в педагогическом училище и 25-й общеобразовательной школе. В этот же период (1933) В. Цвирко был избран членом оргкомитета Союза художников СССР. В 1935 году он поступил в Московский государственный художественный институт, где учился у знаменитых русских пейзажистов С. Герасимова, Г. Ряжского, П. Покаржевского, Б. Иогансона, А. Дейнеки, И. Грабаря. На всю жизнь В. Цвирко запомнил слова профессора П. Покаржевского: «На пейзаж я смотрю как на источник живой связи с природой, воспринимаю его как музыку, как поэзию»[2]. Другим выдающимся художником и педа-

---

[1] Виталий Цвирко. Каталог выставки произведений / Авт. вступ. статьи О. А. Сурский. — Москва, 1983. — 32 с. : ил.

[2] Віталь Цвірка. Выстаўка твораў народнага мастака БССР, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння. Каталог / Склад.: І. В. Назімава. — Мінск: Беларусь, 1988. — 24 с. : іл.

гогом, во многом повлиявшим на развитие таланта Виталия Константиновича, был С. Герасимов, прививавший студентам «упорное трудолюбие, стремление к цельности, ясности, простоте»[3]. Постепенно накопленный в московском вузе богатый опыт трансформировался в собственное художественное видение мастера. Уже во время учебы в институте В. Цвирко определил для себя приоритеты в искусстве: он сделал свой выбор в пользу жанра пейзажа. Еще находясь в Самарканде (Узбекистан), куда в 1942 году был эвакуирован Московский государственный художественный институт, В. Цвирко создал цикл этюдов, в которых художник запечатлел своеобразие южной природы («Утро в кишлаке», «На ослике», «Узбекский дворик»; все—1943). Однако среди картин В. Цвирко, написанных в 1940—1950-е годы, есть и сюжетно-тематические композиции, неизбежные в творчестве любого советского художника того времени, желающего «не выпасть» за рамки официального искусства. Первым таким произведением стала дипломная работа «Первый арест И. В. Сталина» (1942), которую Виталий Константинович с успехом защитил в Самарканде. Впоследствии им были созданы такие крупномасштабные композиции на исторические сюжеты, как «Непокоренные» (1947), «Восстание рыбаков на озере Нарочь» (1957) и др. Но для В. Цвирко обращение к многофигурным полотнам на историко-революционную тему было весьма непродолжительным периодом в творчестве.

В 1944 году Виталий Константинович стал членом Московского отделения Союза художников СССР. В этом же году он вернулся в белорусскую столицу, где практически сразу получил крупный заказ на создание серии мемориальных городских пейзажей, связанных с событиями Великой Отечественной войны, а также портретов участников партизанского движения для Государственного музея истории Великой Отечественной войны. Создав значительные сюжетно-тематические композиции, отве-

---

[3] Виталий Цвирко. Каталог выставки произведений / Авт. вступ. статьи О. А. Сурский. — Москва, 1983. — 32 с. : ил.

чающие требованиям социалистического реализма (как следствие — в 1946 году В. Цвирко был принят в Союз художников БССР), он, тем не менее, не оставлял творческих поисков в трактовке образа родной белорусской природы. Он чувствовал, что именно пейзаж — это тот жанр, в котором возможно наиболее полно раскрыть лучшие стороны своего дарования. Не исключено, что на выбор художника повлияло и то, что он вернулся на родину еще до окончания войны. Минск лежал в руинах. Невероятный хаос царил вокруг. Увиденное оставило глубокий след в душе и памяти художника. В Минске В. Цвирко окончательно укрепился в позиции пейзажиста. «Хотелось выписать каждое дерево, каждый кустик, ручей, мостик, потому что все это для меня символизировало возвращение на родную землю. Пейзаж был отвоеванным богатством», — вспоминал художник позднее[4].

В 1940—начале 1950-х годов его этюды еще не обладали тем неповторимым авторским почерком, который спустя десятилетие будет всегда выделять произведения В. Цвирко из ряда других. Однако уже в таких картинах, как «Март», «Март. Холодный день» (обе — 1947), угадывался будущий великий пейзажист. Эти произведения отличаются исключительным чувством цвета, свободой живописного языка. В них художник безошибочно передал едва уловимые переходные состояния в белорусской природе, наполнив содержание непосредственным лирическим переживанием. Искусствовед И. Назимова так характеризует данные картины: «Экспрессия мазка напоминает этюды самаркандской серии, однако их жаркий колорит сменяется на приглушенную гамму, наиболее соответствующую скупому солнцу Беларуси… Скромные сельские мотивы под кистью художника начинают звучать, как струны его души»[5].

В силу объективных причин в период с 1948 по 1953 год художником не было создано ничего, что соответствовало бы истинной мощи его

---

[4] Віталь Цвірка. Выстаўка твораў народнага мастака БССР, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння. Каталог / Склад.: І. В. Назімава. — Мінск: Беларусь, 1988. — 24 с. : іл.

[5] Там же.

таланта. Однако, будучи ярким, одаренным, энергичным человеком, Виталий Константинович компенсировал некоторую «зажатость» в творчестве посредством преподавательской деятельности, в которой значительно преуспел. С 1947 по 1953 год В. Цвирко обучал студентов рисунку, живописи и композиции в Минском художественном училище, в 1956—1963 годах заведовал кафедрой живописи в Белорусском театрально-художественном институте. В 1958 году ему было присвоено ученое звание доцента, и тогда же он стал ректором Белорусского театрально-художественного института.

Смелый новатор, имеющий активную позицию в жизни и творчестве, В. Цвирко во всем стремился к совершенству. В системе преподавания он использовал собственные методы. Для него было принципиально важным всегда поддерживать непосредственную связь со студентами. Народный художник Беларуси Л. Щемелев с благодарностью вспоминал, что именно он, Виталий Константинович, великолепный живописец и учитель, в те студенческие годы поддержал его в непростых поисках собственного художественного «я». О знаменитых пленэрах, на которые В. Цвирко часто выезжал со студентами, можно писать бесконечно. В художественной среде до сих пор об этом ходят легенды… Именно в полуформальной непринужденной обстановке маэстро открывал ученикам все новые горизонты великолепной природы Беларуси и секреты своего мастерства. В этом В. Цвирко, осознанно или нет, следовал традиции старых мастеров, когда учитель работал рядом со своими подопечными и те могли непосредственно наблюдать за процессом создания шедевра. Он учил, что нельзя бездушно писать природу, нужно прежде всего почувствовать внутри себя импульс, зажечь искру, проникнуться глубинной мудростью законов гармонии, по которым существует все живое на земле, и самому стать частью этого… «Только наедине с природой можно услышать ее сердце», — говорил В. Цвирко[6].

---

[6] Віталь Цвірка. Выстаўка твораў народнага мастака БССР, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння. Каталог / Склад.: І. В. Назімава. — Мінск: Беларусь, 1988. — 24 с. : іл.

Ближе к середине 1950-х годов, когда ему было уже за сорок, в жизни мастера начался творческий подъем. Во многом это было обусловлено общими изменениями, произошедшими в общественной и художественной сферах жизни страны. С этого времени многогранный и неповторимый облик белорусской природы являлся для В. Цвирко постоянным неисчерпаемым источником вдохновения. Одним из первых пейзажей, ставшим «поворотным» в его творческой судьбе, можно назвать картину «Около мельницы» (1954), написанную на Столбцовщине. Отныне талант художника зазвучал в полную силу. Благодаря активной творческой позиции, неоспоримому авторитету среди коллег и тому вкладу, который он внес в развитие национальной школы живописи, Виталий Константинович был назначен секретарем правления Союза художников СССР (1961—1967), а с 1962 по 1963 год возглавлял правление Союза художников БССР.

Принципом работы В. Цвирко стал постоянный поиск новых образных мотивов родных пейзажей, их оригинальных композиционных решений. Он предпочитал творить на лоне природы, получая необходимый творческий импульс от непосредственного общения с ней. Писал на одном дыхании: ему хватало одного — двух сеансов. В. Цвирко умел уловить в каждом мотиве то главное, что составляло его сущность. Свои яркие впечатления он виртуозно воплощал на холсте с помощью современных изобразительных приемов.

В конце 1950 — начале 1960-х годов новым для художественного языка станковой живописи стало привнесение в него лаконизма, экспрессивности, острых линейных ритмов, колористической сдержанности с яркими цветовыми акцентами — средств выразительности, характерных для монументального искусства. Это было связано с так называемым «суровым стилем», который пришел на смену пафосному искусству сталинской эпохи. В жанре пейзажа такие тенденции проявились в создании полотен эпического звучания, обобщенных образов-символов родной земли. В картинах данного периода («Логойский сказ» (1960), «Моя Родина» (1960), «На озере Свирь» (1962), «Неман» (1962), «Сказание о Полесье»

(1964—1965) и «Браслав» (1966) (обе — из серии «На земле белорусской»)) В. Цвирко стремился наиболее полно выявить типичные признаки белорусской природы и в яркой живописной форме воплотить красоту просторов родной Беларуси, запечатлеть ее романтический образ. За серию пейзажей в 1963 году ему было присвоено почетное звание «Народный художник БССР», а в 1967 году за серию пейзажей «На земле белорусской» — почетное звание «Лауреат Государственной премии БССР». Однако художник довольно скоро отошел от увлечения «суровым стилем». Его яркое и незаурядное дарование не могло ограничиться ни одним из канонов, существовавших в искусстве. На основе синтеза впечатлений от непосредственного наблюдения природы у художника выработался своеобразный стиль, отличающийся от всего того, что было сделано им в предыдущий период. Несмотря на переход к экспрессивному мазку, его пейзажи становились все более реалистичными. При этом мастер считал, что «...важно сохранять такой взгляд на природу, чтобы пейзаж узнавался именно как белорусский, который не спутаешь ни с каким другим»[7].

Он создал многочисленные пейзажи-сказания, которые стали классикой белорусской живописи («Браслав» (1966), «В Песках» (1966), «Родной край» (1968), «Столбцы» (1968), «Ганча — земля партизанская» (1969), «Коложа» (1969), «Заславль» (1974), «Мартовское солнце» (1982), «Розовый день» (1982)). В произведениях В. Цвирко почти всегда отсутствовали внешние приметы времени. При этом сам образный строй его картин, оригинальность композиционных решений, энергичный линейный ритм, мощный колорит, экспрессивный мазок соответствовали духу эпохи, в которую жил и творил маэстро. В лучших произведениях В. Цвирко всегда присутствовала своя неизменная тема и свой лейтмотив.

